Марыйка Мартысевіч (intro і пераклад)
Усе аўтарскія правы належаць выдавецтву Taschen

014-149_Animation_F.




# taschen
## = what i am

**МІСІЯ TASCHEN**
**ВЫБІРАЦЬ НАЙЦІКАВЕЙШЫЯ, НАЙВАЖНЕЙШЫЯ І НАЙАКТУАЛЬНЕЙШЫЯ ПРАДМЕТЫ Ў РАЗМАІТЫМ ШЭРАГУ ДЫСЦЫПЛІНАЎ, КАБ РАБІЦЬ ПРЫГОЖЫЯ, УНІКАЛЬНЫЯ, ВЫСАКАЯКАСНЫЯ КНІГІ ПА ГЭТЫХ ПРАДМЕТАХ, ПЕРАКЛАДАЦЬ ІХ НА МНОГІЯ МОВЫ І РАБІЦЬ ІХ ДАСТУПНЫМІ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ. КОШТЫ ВАГАЮЦЦА АД НЕКАЛЬКІХ ДАЛЯРАЎ ДА НЕКАЛЬКІХ ТЫСЯЧ, ТАК ШТО ЛЮДЗІ З ЛЮБЫМ ПРЫБЫТКАМ МОГУЦЬ НАБЫЦЬ ВЫДАНЬНІ TASCHEN БЯЗ ШКОДЫ ДЛЯ СВАЙГО БЮДЖЭТУ. МЫ СПАДЗЯЕМСЯ, ВАМ СПАДАБАЮЦЦА НАШЫЯ КНІГІ ГЭТАК ЖА, ЯК НАМ ПАДАБАЕЦЦА РАБІЦЬ ІХ!**

**ПРЫЕМНАГА ЧЫТАНЬНЯ
КАМАНДА TASCHEN**

www.taschen.com

Выпадкова заблукаўшы пасьля чарговай стыпухі на кніжны развал, вы спыняецеся перад важкім выданьнем з густоўнай вокладкай. Раптам ловіце сябе на думцы, што гатовыя пайсьці дамоў бяз бабак, але з гэтай Кнігаю. Ня дзіўна і 100%-ва: у вас у руках нешта з прадукцыі Taschen - найбуйнейшага сусьветнага выдавецтва кніг, альбомаў і энцыкляпэдыяў мастацтва.
Taschen сёньня - гэта самае аўтарытэтнае выдавецтва сярод людзей мастацтва, нягледзячы на тое, што яго дзейнасьць скіраваная збольшага на аматараў рознага кшталту arts, чым на прафэсіяналаў. Але і тыя, і другія - у пастаянных разборках, хто ж стырыў ідзі з альбомаў Taschen. Але, нягледзячы на гэта, яны палка прызнаюцца выдавецтву ў каханьні да магілы і з надзеяй пакідаюць у гасьцёўні на www.taschen.com спасылкі на свае віртуальныя галерэі.
Разам з выпускам салідных сэрыяў, прысьвечаных клясычнаму мастацтву, Taschen зьбірае, апісвае і сыстэматызуе найцікавейшыя фічы сучаснасьці і нядалёкага мінулага. Мужчынскія прыгодніцкія часопісы ў пасьляваеннай Амэрыцы, гома-арт, ГДР-дызайн, абутак 70-х, энцыкляпэдыя манга, гісторыя амэрыканскай рэклямы, хентай, фотаэротыка, каляндарнае мастацтва Індыі, каталёг арыгінальных дарожных знакаў. А рупліўцы спажывецкай культуры, якія працуюць у самых розных сфэрах, могуць, дзякуючы Taschen, падпісаць пад сваімі артэфактамі "таксама мастацтва".
Тое, што CD імкнуўся рабіць цягам некалькіх гадоў у фармаце шэрага глянцу, Taschen робіць вялікімі накладамі, з шыкоўнымі ілюстрацыямі (нагляднасьць - несумненная перавага выданьняў), якія засьцяць вочы нават самым зацятым снобам ад культуралёгіі і мастацтвазнаўства. І суправаджае ўсё гэта інфарматыўнымі тэкстамі, зразумелымі ўсяму сьвету (беларуская стаецца 21-й мовай Taschen).
Сёньня мы друкуем урыўкі з кнігі "Animation Now!", якая паступіць у гэтым месяцы ва ўсе паважныя кнігарні сьвету. Калі яна трапіць у Менск, пакуль невядома. Але факт: прачытаўшы ўрыўкі з "Animation Now!" у гэтым нумары CD, вы зможаце зразумець, што гэта будзе за яна.

**ГАСЬЦЁЎНЯ WWW.TASCHEN.COM**

**Graham Chandler, Ірляндыя:** Taschen штурхае культуру і мастацтва наперад без снабізму і прэтэнзіяў на элітарнасьць - pin-up мае гэткую ж эстэтычную вартасьць, як Караваджа. Я яшчэ ніколі ня бачыў кнігі Taschen, якой бы мне не хацелася купіць.

**Ana Biscaia, Партугалія:** Сапраўдныя кнігі - кшталту тых, якія робіць Taschen - гэта акт сапраўднага гуманізму. Мяркую, зямля стаецца лепшаю, таму што на ёй працуеце вы! From Lisboa with love...

**Ibgirl, Злучаныя Штаты:** Кнігі Taschen - National Geographics мастацкай эротыкі! Я ў захапленьні!

**Hazel, Канада:** Я закахалася ў хлопца са свайй вуліцы, калі мылася ў яго ванным пакоі і знайшла летні каталёг Taschen на паліцы. Як дыхтоўна! Гэта было як эротыка за замочнай адтулінай - даведацца, што нешта такое існуе. Я зразумела, што каштоўнасьці існуюць і што неўзабаве Mastercard паспрыяе папаўненьню майго кнігазбору.



# БІЛ ПЛАЙМПТАН

**USA**
119 West 23rd St. # 206
New York, NY 10011 USA
Phone: (212) 741- 5544

**ПРАЦЫ**
"Your Face" (1987)
"How to Kiss" (1989)
"25 Ways to Quit Smoking" (1989)
"Plymptoons" (1990)
"Push Comes to Shove" (1991)
"The Tune" (1992)
"Draw!" (1993)
"I Married a Strange Person"(1997)
"Eat!" (2001)
"Mutant Aliens" (2001)

**УЗНАГАРОДЫ**
Cannes 1991,
World Animation Celebration 1998,
Гран-пры Annecy 2001,
Canal + Award Cannes 2001

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Традыцыйная анімацыя, аловак, папера

Вялікая колькасьць гвалту ў працах Біла Плаймптана змусіла многія анімацыйныя студыі зачыніць дзьверы перад ягонымі фільмамі і накласьці вета на некаторыя ягоныя ролікі. Што, аднак, не хвалюе гэтага няўрымсьлівага амэрыканца. Ад яго ў захапленьні кінафэстывальшчыкі, MTVшнікі і ўсе тыя, хто любіць дзёрзкасьць. Галівудзкая Акадэмія нават намінавала яго на Оскара за кароткамэтражны фільм "Твой твар". Спрытны почырк і палітнекарэктнасьць Плаймптана спачатку праявіліся ў коміксах і ілюстрацыях да такіх выданьняў, як The New York Times, Vogue, Vanity Fair, Rolling Stone, Penthouse і National Lampoon. Свой першы анімацыйны фільм Плаймптан зрабіў яшчэ студэнтам. Ён зьняў увесь фільм дагары нагамі, але гэта не прынесла яму славы. І толькі ў 1987 годзе справы дзівака наладзіліся, адно што ягоныя ідэі засталіся такімі ж. Плаймптан вырашае зрабіць самастойную кар'еру. Ён пачынае маляваць найбольш экстравагантныя і шакуючыя рэчы, якія толькі можна ўявіць. Свабодны ад уплыву агентаў, прадусараў і іншых, хто нагадвае яму пра статыстыку продажаў альбо чульлівасьць гледачоў, ён дасягнуў шалёнага посьпеху. Плаймптан фінансаваў, прадусаваў і зьняў некалькі анімацыйных фільмаў: "Я пабраўся зь дзіўнай асобай", "Мэлёдыя" і "Іншапланэтныя мутанты". Нядаўна ён абвесьціў, што працуе над новым фільмам пад назвай "Валасы высока" і ўсталяваў вэб-камэру ў сваёй майстроўні. Зараз усе ахвочыя могуць сачыць за ягонай працай у рэжыме жывога часу.
Сучаснае грамадзтва ўвесь час трапляе пад пільнае дасьледаваньне Плаймптанаўскага бязьлітаснага алоўка. Улюбёныя тэмы ўключаюць непрывабныя аспэкты штодзённага жыцьця, стасункі палітыкаў і тых, хто кантралюе індустрыю культуры. А чалавечае цела ў ягоных гісторыях пакутуе ад усіх заганаў духу.

**animation now!**
да выхаду кнігі







CD
028

# СТУДЫЯ "BLUE SKY"

**USA**
E-mail: info@blueskystudios.com
Адрас: 44 South
Broadway, 17th Floor,
White Plains, NY 10601
Тэлефон: + 1 914. 259.6500
Факс: + 1 914. 259.6499

**ПРАЦЫ**
"Joe's Apartment - Funky Towel" (1996)
"Bunny" (1998)
"Ice Age" (2002)
"Gone Nutty" (2003)

**УЗНАГАРОДЫ**
Academy Award 1999,
Дзіцячая прэмія, Обэргаўзэн 1999,
Першая прэмія фэстывалю мастацкіх фільмаў,
Лос-Анджэлас, 2003

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Кампутарная графіка




Скрэт, зубатая вавёрка з мульціка "Ледавіковы пэрыяд", ня толькі здолела заваёрбаваць легіён прыхільнікаў па ўсім сьвеце, але таксама заваявала сабе права траліць у новыя дагістарычныя прыгоды ў кароткамэтражцы "Зьнесеныя дах". Абодва фільмы былі намінаваныя на "Оскар" і спрычыніліся да пашырэньня славы студыі "Blue Sky".
Крыс Ведж заснаваў студыю ў 1987 годзе, і яна адразу ж зрабілася першапраходцам у пастаўцы лічбавай анімацыі ў аўдыёвізуальную індустрыю. Прусачкі, якія сьпяваюць і танчаць на MTV у культавай "Кватэры Джо", ілюструюць цудоўную ўзаемасувязь, якая можа існаваць паміж забаўляльнай індустрыяй і тэхналёгіяй. Менавіта гэтая ідэя зрабілася адметным прынцыпам "Blue Sky". У 1997 годзе кампанія стала вядучым дэпартамэнтам лічбавай анімацыі і спэцэфэктаў у "Fox Filmed Entertainment".
Стужка "Трусік", якая атрымала "Оскара" за лепшую анімацыйную кароткамэтражку, паспрыяла значнаму прагрэсу ў мадэляваньні сьвятла ў лічбавым дызайне. Студыя Крыса Веджа прыклала для гэтага шмат намаганьняў, стварыўшы ўнікальнае абсталяваньне для імітацыі таго, як кладзецца сьвятло на створаныя лічбавым чынам аб'екты і паверхні.
З дапамогай гэтых рэсурсаў, а таксама павялічыўшы ўзровень прадуктыўнасьці ў перадачы карцінкі, у студыі "Blue Sky" выпрацавалі ўласны стыль, які адрозьнівае як іх фільмы, так і рэкламныя ролікі.
Бразыльскі аніматар Карлас Салданга, новае імя ў мультыплікацыі, уваходзіць у каманду "Blue Sky" з 1993 году. Салданга, сурэжысэр "Ледавіковага пэрыяду" і рэжысэр "Зьнесаных дахаў", прыцягнуў увагу Веджа сваёй прадусарскай працай у фільме "Час для каханьня", адзначанай шматлікімі ўзнагародамі мілоснай гісторыі дзьвюх драўляных лялек, якія кідаюць выклік механічнай руціне гадзіньніка зь зязюляй.

CD
028



## "DUCK SOUP PRODUCTIONS"



**USA**
2205 Stoner Ave.
Los Angeles, CA 90064
T: 310. 478.0771 / 310. 478.0773
inbox@duckstudios.com

**ПРАЦЫ**
"The Snow Man"

**УЗНАГАРОДЫ**
1-я прэмія Directv- Level 13. net - Los Angeles, 2002
Бронзавая ўзнагарода, Kalamazoo, 2002
Лепшы мультфільм, Індыйскі кінафэстываль, Галівуд, 2002

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Традыцыйная анімацыя, 2D і 3D камп'ютарная графіка, Інтэграцыя з жывымі здымкамі

Калі паспрабаваць уявіць сабе студыю, здольную ператварыць любую ідэю ў дынамічны, сучасны і крэатыўна анімаваны фільм, то атрымаецца нешта падобнае да студыі "Duck". Вядомая раней як "Duck Soup of Los Angeles", кампанія займалася прадусаваньнем ухвальна сустрэтай кароткаметражкі "Сьнежны чалавек" і мае значны досьвед прадусаваньня рэклямных ролікаў, заставак, title designs, відэа і г.д.
У групу рэжысэраў "Duck" уваходзяць і такія тытуляваныя і дасьведчаныя, як Роджэр Шуінар, Джон Хаўлі, Пол Уэстэр ("Прамень сонца", "Пікнік", Пакрадзеныя") і Грэхам Морыс, а таксама новыя таленты з усяго сьвету: Ніко Мэўлеман ("Музэй", "Курыныя даліны"), Стыў Кіркалайс ("Гульня зь перашкодамі"), Эрых Дойчман ("Раскол"), Джэф Дру ("Шпацыр"), Брук Кізьлінг ("Boobie Girl"), Нікалас Канг, Лэйн Накамура і Джэонг-А Сэонг.
Усе яны разам ствараюць шырокі спэктар тэхнічнага і мастацкага майстэрства ўключна з эксьпэрымэнтальнай анімацыяй. У гэтым прычына шматграннасьці рэклямнай вытворчасьці студыі, якая мае кліентаў кшталту Coca Cola, Levi's, General Motors, McDonald's альбо Universal Studios, а таксама Мэрайі Кэры ці Limp Bizkit.
Студыя "Duck", якая традыцыйна асацыявалася з клясычнымі анімацыйнымі тэхналёгіямі, з 1990-х пачала выкарыстоўваць лічбавыя выявы. З таго часу сцэнарысты і аніматары былі сабраныя ў адмысловую сэкцыю, аб'яднаную з мэтай ствараць новыя ідэі для кіно і ТБ. Студыя валодае самымі сучаснымі прыёмамі графічнага дызайну і лічбавых эфэктаў. Сярод іх - Інтэграцыя анімацыі з жывымі здымкамі, тэхніка, якая надала іх апошнім ролікам характэрнае адценьне шарму і індывідуальнасьці.

animation now!
да выхаду кнігі

## КАНСТАНЦІН БРОНЗІТ

**РАСЕЯ**

**ПРАЦЫ**
"Карусаль" (каля 1988)
"Memento Mori" (1991)
"Бывай!" (1993)
"Тук-Тук" (1993)
"Switchcraft" (1994)
"Pacifier" (1994)
"Die Hard" (1997)
"На краі зямлі" (1999)
"Бог" (2003)

Дасканалае валоданьне прыёмамі драматычнага эфэкту анімацыі, цудоўны талент пародыста і прага да экспэрымэнту з новымі мэтадамі ператварылі расейскага аніматара Канстанціна Бронзіта ў адно з самых выбітных імёнаў эўрапейскай анімацыі. Дзівацкі гумар яго апошніх фільмаў "На краі зямлі" і "Бог" зачараваў гледачоў і журы на некалькіх самых салідных міжнародных кінафэстывалях. У першым маленькі дамок, што ледзь-ледзь трымаецца, балянсуючы на вяршыні гары, становіцца прычынай пацешных выпадкаў, якія адбываюцца зь яго жыхарамі. У апошнім мае месца бясконцае сьвятатацтва паводле матываў індуізму.

**УЗНАГАРОДЫ**
Гран-пры - Annecy, 1995
Гран пры TV-Annecy, 1997
Лепшы кароткаметражны фільм - Anima Mundi/ Рыо дэ Жанэйра, 1999
Спэцыяльны прыз журы, прыз глядацкіх сымпатыяў і прыз за найсьмяшнейшы фільм - Annecy, 1999
Golden Spike - Valladolid, 1999
Лепшая анімацыя - Tampere & Krakow, 1999

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Аловак, папера, традыцыйная анімацыя, 2D і 3D камп'ютарная графіка

KONSTANTIN BRONZIT



OD
037



## КАНСТАНЦІН БРОНЗІТ

Бронзіт нарадзіўся ў 1965 годзе ў Санкт-Пецярбургу і там скончыў факультэт дызайну мастацкай вучэльні. Потым працаваў мультыплікатарам у студыі, якая спэцыялізавалася на навукова-папулярных фільмах. У гэты пэрыяд зрабіў сваю першую стужку "Карусэль". З 1988 па 1994 год ён маляваў карыкатуры для газэт і часопісаў, многія зь якіх узялі першыя прызы ў сваёй катэгорыі на міжнародных фэстах. У той жа час працягваў здымаць кароткамэтражкі, якія, таксама зь безьліччу ўзнагародаў, пацьвердзілі яго здольнасьці ў традыцыйнай і камп'ютарнай графіцы.
Падчас удзелу ў міжнароднай праграме для эўрапейскіх аніматараў на францускай студыі "Folimage Valence Production" Бронзіт распрацаваў і зьняў кароткамэтражны мультфільм "На краі зямлі". Фільм атрымаў каля 70-ці прэміяў і быў намінаваны на "Цэзара", найпрэстыжнейшую прэмію францускага кіно. Ягоны "Бог" – гэта лічбавы кароткамэтражны фільм у 3D, які ўдзельнічаў у Directors' Fortnight і Канскім фэстывалі.
У 2004 г. Канстанцін Бронзіт рыхтуе кароткамэтражны фільм "Lavatory-Lovestory" – "Сартырнае каханьне", сама назва якога адлюстроўвае яго вернасьць высьмейваньню штодзённага жыцьця.

## СТУДЫЯ "LOOSE MOOSE"

74 Berwick Street,
London W1F 8TF
UNITED KINGDOM
T: 0207 287 3821
Fax: 0207 734 4220
info@loosemoose.net
www.loosemoose.net

**ПРАЦЫ**
"Balloon", "Паветраны шарык" (1991),
"I pagliacci, Altered Ego" (1994)
"Interrogating Ernie" (2000)
"Thunder Pig" (2001)

**УЗНАГАРОДЫ**
Лепшы кароткамэтражны анімацыйны фільм – BAFTA, 1991
Gold Hugo – лепшы студэнцкі анімацыйны фільм – Chicago, 1994
Лепшы дэбют – Ottawa, 1994
Лепшы TV-пілёт – WAC/USA, 2001
Прыз журы – Anima Mundi/
Rio de Janeiro, 2002

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Традыцыйная анімацыя,
пластылінавая анімацыя,
лялечная анімацыя,
2D і 3D камп'ютарная графіка,
зьмяшэньне ўсіх тэхналёгіяў
з жывымі здымкамі

Сыльвэстар Сталонэ, Фрэнк Сынатра, Элвіс Прэсьлі і Брус Уіліс – пэрсанажы знакамітай "Кампаніі Ліптана Брыска ў Злучаных Штатах". Такім жа чынам анархістычныя ролікі "Peperami snacks" штодзённа прыцягваюць увагу ангельскай публікі. За гэтымі і іншымі пасьпяховымі прыкладамі прарываў тэлерэклямы па ўсім сьвеце хаваецца талент каманды "Loose Moose".
Рэжысэр Кен Лідстэр і прадусар Глен Гольбэртан стварылі кампанію са штабам у Лёндане ў 1994 годзе. Праз год да іх далучыўся рэжысэр Эндж Пэлэрторп. Лідстэр выйграў прэмію BAFTA за паэтычны "Паветраны шарык" – свой дыплёмны праект у Нацыянальнай кіна- і тэлешколе. Эндж, выпускнік той жа ўстановы, стаў вялікім адкрыцьцём фэстываляў у Чыкага і Атаве зь фільмам, які ён таксама рыхтаваў як свой дыплёмны, – эклектычным і сафістычным "Altered Ego". Гольбэртан, які працаваў у сфэры з 1978 году, быў прадусарам некаторых фільмаў Бары Пурвза, што атрымалі ўзнагароды, а таксама кіраваў іншымі студыямі.
Усе разам яны дапамаглі "Loose Moose" заняць сваё пачэснае месца сярод найбуйнейшых камэрцыйных студыяў на міжнародным рынку. Кен Лідстэр не згубіў сувязі з мастацкім кінэматографам, маючы ў актыве аўтарскую працу "I pagliacci". Каманда "Loose Moose" любіць брацца за цяжкія, але цікавыя прапановы, якія вымагаюць зьмяшэньня розных тэхналёгіяў з жывой акторскай ігрою. Такім чынам, у гэтай студыі адушаўляецца ўсё – ад фотакапіявальных машынаў, што засмучана згадваюць пра стары добры час, да матарызаваных шкілетаў, якія рухаюцца з дасканалай сынхроннасьцю пад музыку гурта Fingathing. Зьдзейсьняльна ўсё: проста зьвярніцеся да іх.

animation now! да выхаду кнігі







CD
C2B

## АНІМАЦЫЙНАЯ СТУДЫЯ "PIXAR"

**USA**
www.pixar.com

**ПРАЦЫ**
"Luxo Jr." (1986)
"Red's Dream" (1987)
"Tin Toy" (1988)
"Knick Knack" (1989)
"Toy Story" (1995)
"Geri's Game" (1997)
"A Bug's Life" (1998)
"Toy Story 2" (1999)
"For the Birds" (2000)
"Monsters, Inc." (2001)
"Mike's New Car" (2002)
"Finding Nemo" (2003)
"Boundin'" (2004)

**УЗНАГАРОДЫ**
Gold Gate Award - San Francisco, 1987
Academy Award Best Short
Animated Film, 1988/ 1997/ 2001/ 2003
Academy Award Scientific and
Engineering, 1991/ 1992/ 1994/ 1995/ 1997
Gold Medal Clio Awards, 1994
Academy Award for Special
Achievement, 1995
Academy Award for Technical
Achievement, 1996/ 1998
Annie Awards, 1996/ 1998/ 2000
Public Prize - Annecy, 1998
Grammy, 1999
Academy Award of Merit, 2000
Golden Globe Best Picture, 2000
Academy Award Best Original Song,
2001
Children's Award - BAFTA, 2002
Vanguard Award - Producer's Guild of
America, 2002

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
3D кампутарная анімацыя

Для каманды "Pixar" тэхналёгія - гэта Мастацтва зь вялікай літары М. Праца гэтай студыі з Эмэрвілю (Каліфорнія) паспрыяла прынясьцю непадрыхтаваным гледачом 3D графікі кампутарных мультоў і дапамагла зьмяніць выгляд шырокаэкраннай анімацыі. Лягатып кампаніі, які зьяўляецца ў пачатку ўсіх іхных фільмаў, выклікаў першы посьпех Джона Ласэтэра, выканаўчага і крэатыўнага віцэ-прэзыдэнта. Пацешныя і сэнтымэнтальныя лямпы зь "Люксо-малодшага" далі зялёнае сьвятло ў справе спалучэньня кампутарнай графікі і эмацыйнасьці, што лічылася ў васьмідзясятыя прывілеем выключна традыцыйнай анімацыі. З таго часу зь мікрачыпаў Ласэтэра & К° выйшлі раўнівыя цацкі, летуценныя ровары, шалёныя казуркі, монстрыкі-панікёры, помсьлівыя птушкі і гарэзьлівая рыбка.
Ласэтэр, у мінулым аніматар кінастудыяў "Disney" і "Lucasfilm", знаходзіцца ў цэнтры кампаніі з часоў анімацыі "Steve Jobs, of Apple", створанай "Pixar" у 1984 годзе. Ён жа распрацаваў унікальныя сыстэмы праграмнага забесьпячэньня ("Марыянэтка", Ringmaster and RenderMan), што дае хуткія і выдатныя вынікі. Паводле пагадненьня, падпісанага з Дыснэем у 1991 годзе, Джон Ласэтэр зьняў свой першы цалкам лічбавы мультфільм - рэвалюцыйную "Цацачную гісторыю". Пасьля былі іншыя надзвычай пасьпяховыя поўнамэтражныя фільмы і чатыры "Оскары", якія зрабілі "Pixar" папулярнай і вядомай студыяй.



## "TEZUKA PRODUCTIONS"

Tezuka Productions Co., Ltd.
Founded 1968
4-32-11 Takadanobaba
Shinjuku-ku
Tokyo 169- 857
**JAPAN**
www.tezuka.co.jp

**ПРАЦЫ**
"Hsi Yu Chi / The Journey to the West" (1960)
"Astro Boy" (series, 1963)
"Jungle Emperor Leo" (1965/ 1966/ 1997)
"Cigarettes and Ashes" (1985)
"One Million Year Trip: Bander Book" (1978)
"Jumping" (1984)
"Broken Down Film" (1985)
"The Legend of the Forest" (1987)
"The Film Is Alive" (1990)
"Black Jack: The Movie" (1996)

**УЗНАГАРОДЫ**
The 1st Ofuji Nobuo Award
Mainichi 1963,
Special Award Asian Film Festival 1967,
Grand Prize and Unesco
Award Zagreb 1984,
Grand Prix Hiroshima 1985,
CIFEJ Youth Award Zagreb 1988

**СФЭРА ІНТАРЭСАЎ**
Традыцыйная анімацыя,
кампутарная графіка,
флэш-анімацыя



Ад манга да анімэ, Осаму Тэзука (1926 - 1989) пасьля Другой Сусьветнай вайны практычна стварыў новую японскую поп-культуру, скарыстоўваючы нязнаную дагэтуль манэру аповеду разам з "кінэматычным" мастацтвам і натуралістычнымі сюжэтамі папяровых коміксаў. Японец зрабіў разнастайным стыль коміксаў, ператварыўшы іх у мастацкую форму і прадукт нацыянальнай значнасьці. Ён таксама вынайшаў шмат дэталяў, якія выкарыстоўваюцца ў манга дагэтуль - напрыклад, вялікія вочы ў пэрсанажаў. Осаму Тэзука сваім першым сэрыялам "Зорны хлопчык" адкрыў той патэнцыял, якім валодае тэлевізія.
Першай японскай студыяй анімацыі была менавіта ягоная "Mushi" (1960), дзе ствараліся і анімэ-тэлесэрыялы. У апошніх ён перапрацоўваў многія са сваіх папярэдніх твораў ("Магутны атам" ("Зорны хлопчык"), "Фэнікс 2772" і інш.). Фільмы Осаму Тэзукі, які памёр ва ўзросьце 61 году, афарбаваныя інтэлектуальным крытыцызмам, што нячаста сустрэнеш у сучасным анімэ. Яго пасьлядоўнікі пераймалі ад майстра любоў да фармальных пошукаў і дух абаронцы навакольнага асяродзьдзя, міру і дзяцей.
"Тэзука Прадакшн" разам з мастацкімі фільмамі і тэлесэрыяламі стварыла экспэрымэнтальную анімацыю, якая наклала адбітак на цэлую эпоху. Першы Міжнародны анімацыйны фэстываль у Хірасіме прысудзіў гран-пры "Правальнаму фільму", рэтра-вэстэрну, у якім герой вымушаны змагацца не толькі супраць бандытаў, але таксама супраць няякаснага кіно.
Студыя "Тэзука Прадакшн" усё яшчэ актыўна дзейнічае, працягвае выпускаць матэрыял, заснаваны на творах Тэзукі. Цяпер рыхтуецца рэмэйк найвялікшага шэдэўра Тэзукі "Фэнікс", які будзе гатовы да 2006 году.

animation now!
да выхаду кнігі



CD
029